— Видя то, что происходит в экономике Беларуси, —- говорит Дмитрий Сенько, — учитывая чиновничий беспредел, уверен, что в отношении меня ведется уголовное преследование незаконно. Я думаю, что причина этому мои бывшие родственные связи — я бывший зять Александра Козулина. Ходят слухи о том, что после президентских выборов началось давление на семью Козулина. Меня, видно, тоже причислили к его семье, несмотря на то, что с Ольгой Козулиной мы расстались в конце 2003 года. Фирму, в которой я работал директором, умышленно ввели в банкротство. На документах, на основании которых в отношении меня выдвинуты обвинения, стоит не моя подпись, а подделка, что доказано экспертизой. Несмотря на это, несмотря на все мои жалобы и заявления ни один из контролирующих государственных органов страны не предпринял мер по умышленному рейдерству в отношении моего предприятия, а также восстановления законности и снятия с меня всех обвинений.

Если суд признает Дмитрия Сенько виновным, ему грозит лишение свободы на срок от 2 до 5 лет или ограничение свободы, так называемая химия, на этот же срок. К слову, за выманивание кредита в особо крупном размере был осужден депутат 2-го созыва Сергей Скребец. Наказание Скребец отбывал в витебской колонии "Витьба-3".

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ОФИЦИАЛЬНО

Тесты хотят сделать платными

Государство сможет зарабатывать на этом до трех миллионов долларов в год

Чиновники подсчитали, что на проведение тестирования из государственной казны уходит немало денег. И решили, а почему бы эти затраты не переложить на плечи самих абитуриентов, вернее — их родителей. Уже определились и с суммой — 15 долларов за три обязательных теста.

Если учесть, что в этом году в тестировании приняло участие 195 тысяч человек, несложно подсчитать, сколько в среднем сможет зарабатывать государство на проведении тестирования — приблизительно 3 миллиона долларов.

Не противоречит ли эта инициатива "Закону об образовании", который гарантирует белорусам бесплатное среднее образование? — поинтересовались мы у первого заместителя главы Администрации президента Анатолия Рубинова. Он, к слову, и озвучил данную инициативу на пресс-конференции, посвященной итогам централизованного тестирования в этом году.

— А это не образование, это регистрационный взнос при поступлении в вуз, — заявил Анатолий Рубинов. — Человек может и не поступить. Но для того, чтобы организовать этот процесс, его надо обеспечить. Спрашивается, почему все налогоплательщики должны отдавать свои деньги на то, что люди идут сдавать тесты, тренируются, что они обеспечены хорошими тестами. Ясно, что люди должны сами об этом побеспокоиться. Это не относится к образованию. Образование в нашей стране можно получить и бесплатное, если показать хорошие результаты на тестировании. Но организация проведения тестов стала весьма затратной и требует постоянного совершенствования. Это не застывшая система, деньги постоянно будут нужны.

— Для выпускников школ, которые будут сдавать тесты впервые, сделают исключение?

— Мне часто задают этот вопрос. Но что такое 30 тысяч? Разве это много? Это не проблема ни для какой семьи. Если окажется так, что ребенок сирота, можно будет предусмотреть, чтобы он не платил. Что сегодня у нас? Все за счет государства. А что такое государство — это наши с вами налоги. Бесплатного ничего не бывает. И поэтому все эти выкрутасы, которые проделываются, общество должно оплачивать? Наверное, надо, чтобы и те, кто заинтересован в поступлении — семьи абитуриентов, приняли в этом участие.

ПО ТЕМЕ

Дочь министра образования набрала 349 баллов

Тесты в этом году, по мнению членов Государственной комиссии по контролю за ходом подготовки и проведения вступительной кампании, были сложные.

"Зачем такие тесты, на которые никто не может ответить?", — заявил председатель госкомиссии, первый замглавы Администрации президента **Анатолий РУБИНОВ.** — Я так рассуждаю: у нас поступает в вузы примерно 80 тысяч человек. Но хоть кто-то из них должен знать на отлично хотя бы один предмет. Но этого нет. Пришла пора разобраться с качеством тестов". Рубинов привел такие данные. В этом году прошли тестирование 195 тысяч человек. Если суммировать все тесты, которые писали абитуриенты, получится свыше 500 тысяч работ. Максимальный балл — 100 — был поставлен только 18 раз. На 95 баллов и выше написали тесты не более 2 процентов поступающих. Тесты по некоторым предметам были настолько сложные, что выпускники показывали результаты близкие к нулю. Средний балл по физике при тестировании составил всего лишь 24,7, по математике — 32,7. При этом надо учитывать, что математика стала самым популярным предметом у абитуриентов. В этом году писать тесты по математике пришли 127 тысяч человек.

На стадии тестирования отсеялось 25 тысяч абитуриентов. По одному из предметов они набрали менее 15 баллов, а с такой суммой сертификаты в вузы страны не принимаются.

К слову, конкурс в вузы в этом году ожидается приблизительно такой же, как и в прошлом.

Среди поступающих в этом году есть и дети высокопоставленных чиновников. Например, дочь министра образования Александра Радькова.

"Буквально вчера ко мне подходили министр и его заместитель, советовались, в какой вуз их детям подавать документы, — рассказал первый замминистра образования Александр Жук. — Дочь министра набрала 349 баллов, сын другой нашей коллеги 250. Они спрашивали, на каких специальностях в прошлом году какой был конкурс. Дочь министра училась в лицее БГУ, с репетиторами не занималась. Как правило, выпускники лицея поступают в вузы".

Однако в этом году не повезло сыну другого высокопоставленного чиновника. Юношу удалили из аудитории во время тестирования: он взял на экзамен мобильный телефон. По словам Анатолия Рубинова, высокое положение папы сыну не помогло, ему не разрешили пересдать тест в резервный день.

"Отец обратился ко мне за помощью, — рассказал Анатолий Рубинов. — Они принесли справку, что за тот период времени, что шло тестирование, телефон сына не включался, мы собрали даже комиссию по этому вопросу. Парня было жаль. Но что делать, порядок единый для всех. Если мы разрешим одному, значит, посыплются и все остальные".

По словам Анатолия Рубинова, сейчас по блату в Беларуси поступить невозможно. "Сегодня ректоры спокойно вздохнули, — говорит он. — Раньше, не секрет, поступали по блату. Ради ребенка шли на все. Система тестирования не только обеспечивает честное поступление, она убирает очень сложный фактор — люди не идут на нарушения".

Однако в прошлом году во время вступительной кампании было возбуждено 14 уголовных дел.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

САЛІДАРНАСЦЬ

Дапамога ад Аляксандра Салжаніцына

Рускі грамадскі фонд Аляксандра Салжаніцына (Масква) прапануе матэрыяльную дапамогу ахвярам сталінскіх рэпрэсій, якія жывуць у Беларусі. Пра гэта паведаміла старшыня грамадскага аб'яднання "Беларуская асацыяцыя ахвяр палітычных рэпрэсій" Зінаіда Тарасевіч.

Паводле яе слоў, у Беларусі прыблізна 90 чалавек атрымліваюць пастаянныя выплаты з фонду Салжаніцына. "Яго праўленне прапануе тым былым палітзняволеным, хто не ведае аб існаванні фонду, звярнуцца ў яго маскоўскае прадстаўніцтва па адрасе: 103009, Расія, Масква, вуліца Цвярская, дом 12, пабудова 8, кватэра 169; тэлефон 8-107-495-629-86-39", — сказала З.Тарасевіч. Паводле яе слоў, у праўленне фонду могуць звяртацца як рэабілітаваныя, так і нерэабілітаваныя ахвяры сталінізму.

Да ведама. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры А.Салжаніцын заснаваў фонд у 1974 годзе адразу пасля выгнання з СССР. Фонд аказвае сістэматычную дапамогу ахвярам палітычных рэпрэсій, а таксама фінансуе праекты, звязаныя з захаваннем рускай культуры.

Марат ГАРАВЫ.

АКЦЫЯ

27 ліпеня Мікалай Статкевіч будзе чытаць вершы

Дзень, калі была падпісана Дэкларацыя аб суверэнітэце, палітык Мікалай Статкевіч са сваімі сябрамі вырашыў адзначыць па-свойму.

— Сабакі ў мяне няма, а таму на плошчу Бангалор ісці я не хачу, — кажа **Мікалай СТАТКЕВІЧ**. — І людзей трэба адцягваць ад збору ў месцы, дзе выгульваюць сабак. Акцыю мы вырашылі правесці ў цэнтры горада, у скверы ля помніка Янку Купалу. Сімвалічна, што ў гэтым годзе якраз 125-годдзе з дня нараджэння паэта, у ліпені была падпісана Дэкларацыя аб суверэнітэце, а менавіта Купала і з'яўляецца ідэолагам суверэнітэту. Збяромся ля помніка, ускладзём кветкі, пачытаем вершы. Гэта будзе 27 ліпеня ў 17.00. Думаю, санкцыі на тое, што збіраемся зрабіць мы, не трэба. Асабіста я і сам прачытаю верш пра незалежнасць.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ЗДАРЭННЕ

Трагедыя на будоўлі

У Мінску на будаўніцтве будынка пасольства Расіі загінулі двое расійскіх рабочых.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе МНС, рабочыя капалі траншэі па вуліцы Нававіленскай, 1а. У гэты час адбыўся абвал грунту. Адзін чалавек памёр на месцы здарэння, другі — са шматлікімі пераломамі быў дастаўлены ў 9-ю бальніцу, дзе памёр ад траўм.

ВІНШУЕМ

Вольга ДАШКЕВІЧ:

«Сын ніколі не лічыў дзень нараджэння вялікім святам»

20 ліпеня маладзёжны актывіст Зміцер ДАШКЕВІЧ адсвяткаваў сваё 26-годдзе за кратамі шклоўскай калоніі №17.

Нагадаем, што 1 лістапада 2006 года Зміцер быў асуджаны на паўтара года пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі агульнага рэжыму.

У дзень нараджэння Зміцера Дашкевіча карэспандэнт "Народнай волі" пагутарыў з маці маладзёжнага актывіста Вольгай Васільеўнай.

— Цяжка, канешне, усё гэта пераносіць, але што зробіш, — уздыхае Вольга Васільеўна. — У дзень нараджэння адправілі сыну тэлеграму, напісалі: "Даражэнькі, міленькі сыночак, віншуем, жадаем здароўя і вытрымкі, Бог дапаможа". Напрыканцы далі цытату з Бібліі.

— А ці часта ад Зміцера прыходзяць лісты?

— Апошні раз пісьмо прыйшло каля тыдня таму, а да гэтага, напэўна, з месяц не было. Усё піша, каб мы трымаліся, ведае, што турбуемся, што я плачу нярэдка, як плакала б на маім месцы кожная маці. Гэта зараз я крыху супакоілася, а раней... Зрэшты, не будзем пра сумнае.

— Пра свой побыт не расказвае?

— У пісьмах — не. Але ж ведаю, што кормяць там не вельмі, калі ездзіла да яго, то адвезла цэлую сумку прадуктаў — кілбас усялякіх, сялёдкі, розных прысмакаў... Там жа толькі трыццаць кілаграмаў можна, а мы прывезлі ў два разы больш, дык Дзіма кажа: "Мама, вы што, думаеце, у нас тут у казарме халадзільнікі стаяць?" Каб прадукты не папсаваліся, параздаваў ён іх сваім таварышам.

На ўручэнні Нацыянальнай прэміі "За асабістую мужнасць пры абароне правоў чалавека" бацькі Зміцера Дашкевіча — Вольга і Вячаслаў (справа).

— А на дзень нараджэння сустрэчу так і не дазволілі Вам?

— Не, адмянілі ж яе, на жнівень перанеслі. Сын напісаў, што прычапіліся да таго, што не тую майку апрануў — вось і вынеслі спагнанне. Вось вам і злосны парушальнік дысцыпліны, не давялося мне ў гэты дзень сыночка павіншаваць.

— Вольга Васільеўна, а як Зміцер звычайна адзначаў такія дні?

— Ай, не любіў ён гэтую справу. У мінулым годзе святкаванне 25-годдзя прыйшлося якраз на той момант, калі сын паехаў на тры тыдні ў Злучаныя Штаты. Я яму кажу: "Ты там успомні свой маленькі юбілей, усё ж-такі свята". Сын толькі адмахнуўся: "Ай, мама, знайшла свята..." Не любіў ён такія фэсты. Вось, калі дадому на дзень нараджэння прыедзе, то піражкоў яму рабіла, ён галубцы любіць.

— А калі малы быў, то, напэўна, любіў падарункі атрымліваць?

— Як усе дзеці. У захапленні быў ад розных танкаў, верталёцікаў, якія закруцяцца ў люстру, пасля толькі даставай іх. Шмат дарылі сыну кніг, бо ён вельмі любіў чытаць. А пакуль не навучыўся чытаць, проста сядзе і гартае кнігу. Цэлая шафа кніжак была, мы ж яму куплялі іх не толькі на дзень нараджэння. Сабе маглі ў нечым адмовіць, а новую цікавую кнігу з бацькам абавязкова набывалі. І Дзіма адносіўся да іх вельмі беражліва. Усе яго школьныя падручнікі былі ў ідэальным стане.

— А чытаў ён тады больш на беларускай ці на рускай мове?

— На рускай, раней жа выкладанне ў школе было ў асноўным на гэтай мове. Гэта затым ён ужо перайшоў на беларускую — і піша, і чытае, і размаўляе толькі на ёй. Нават мне, калі была ў СІЗА, сказаў: "Ты, мама, калі будуць журналісты тэлефанаваць, адказвай толькі на беларускай мове". Але ў школе, калі вучыўся, больш за ўсё чамусьці любіў хімію. Кожны дзень хадзіў да настаўніцы хіміі дадому за дадатковымі ўрокамі. Прычэпіцца да мяне са сваімі формуламі, я яму кажу: "Сынок, мае веды распаўсюджваюцца толькі на адну формулу — "аш два о". Смяецца тады, аж заліваецца, што я не ведаю нейкае там бромістае злучэнне.

— Вольга Васільеўна, дык ён, аказваецца, усё жыццё марыў стаць хімікам?

— Да апошняга часу ён і сам не ведаў, кім хоча стаць. Але ў апошніх класах ў яго з'явілася цікавасць да напісання сачыненняў, стала атрымлівацца. Павучыўся ў Гродне ў сельскагаспадарчым інстытуце — праз год зразумеў, што гэта не яго, ды кінуў. Папрацаваў крыху, а затым падаўся ў палітыку.

— Вы зараз не шкадуеце, што сын выбраў сабе такі нялёгкі і няўдзячны шлях?

— Шкадую толькі аб адным — што яго зараз няма дома. Мы з бацькам падтрымліваем сына ва ўсіх яго пачынаннях, каб хоць неяк усцешыцца, завальваем сябе пабольш работай, хоць і так працавалі ўсё сваё жыццё. На дачы вось нядаўна паўдня парэчкі збіралі — аж у вачах цёмна было. Дванаццаць літраў соку закаталі, а зараз ужо і грыбкі падышлі, будзем збіраць. Тр[illegible] **Алесь СВЯТЛАНІЧ.** Жыццё ж не заканчваецца...

КРЫМІНАЛ

Шуры-муры Цімура Каклашвілі і Надзеі Таўкшанавай

Цэлы шэраг рэкордаў можна было зафіксаваць у час судовага працэсу, які скончыўся нядаўна ў Талачыне. Рэкордна доўга — амаль паўгода — працягваўся разгляд крымінальнай справы аб раскраданні матэрыяльных каштоўнасцяў сельскагаспадарчага вытворчага кааператыву "Лаўрэнаўка".

Рэкорднай была колькасць дапрошаных у судзе сведкаў — каля 100 чалавек. Рэкорднай для раёна аказалася і сума ўкрадзеных грошай — звыш за 50 мільёнаў рублёў. Але найбольш яна ўразіла тутэйшы народ нават не памерамі, а тым, што была ўкрадзена там, дзе, здавалася б, не было чаго красці. "Лаўрэнаўка" даўно лічылася ледзь ці не самай нішчымнай на Талачыншчыне гаспадаркай. Магчыма, з-за гэтага і пагадзіліся людзі, каб яе ўзначаліў не мясцовы спецыяліст, а нікому не вядомы заезджы чалавек — Цімур Каклашвілі.

Новаспечаны старшыня СВК "Лаўрэнаўка" зрабіўся кіраўніком кааператыву якраз тады, калі гаспадарка рыхтавалася да расфарміравання як безнадзейная. На мехдвары стаяў хіба што адзін спраўны трактар, са шматлікіх колішніх жывёлагадоўчых падраздзяленняў заставалася адна малочнатаварная ферма з ледзь жывымі ад галадухі рагулямі, зарплата даярак не дасягала і 100 тысяч, банкаўскія рахункі СВК былі пустыя. Тым не менш дзяржава, кіраўніцтва якой усё не магло ніяк адмовіцца ад калгаснага ладу, раз-пораз падкідвала грошы менавіта самым нішчымным сельгаспрадпрыемствам, каб яны хоць на паперы існавалі, а вяскоўцы мелі сваю "чарачку са скварачкай" ды ведалі, за каго галасаваць на чарговых выбарах. Вось у гэтых умовах і адбываўся ў "Лаўрэнаўцы" буйнамаштабны крадзеж, якім згодна кіравалі старшыня СВК Цімур Каклашвілі і ягоная верная памочніца — галоўны бухгалтар Надзея Таўкшанава.

Матэрыялы крымінальнай справы сведчаць, што галоўная бухгалтарка складала фіктыўныя ведамасці на выдачу зарплаты людзям, якія не працавалі ў кааператыве, а грошы за іх атрымлівала сама і дзяліла гэтыя даходы з начальнікам. Адначасова яна завышала зарплату сапраўдным работнікам СВК, а розніцу зноў жа прысвойвала. Не раз у змове з Ц.Каклашвілі Н.Таўкшанава налічвала спецыялістам незаслужаныя прэміі, палова якіх ішла ў кішэні Цімура і Надзеі. Дарэчы, ніхто не здзіўляўся ні перабольшаным заробкам, за якія трэба было распісвацца, ні дзіўным прэміям. На гэта і разлічвалі злодзеі, і не памыліліся: памяркоўныя тутэйшыя ўспрымалі крадзяжы спакойна.

Часамі Н.Таўкшанава дзейнічала з неверагодным нахабствам. У 2006 годзе яна свавольна, не маючы згоды праўлення кааператыву, прадавала бычкоў заезджым камерсантам за наяўныя грошы, якія клала ў сваю кішэню. Такім чынам ёю было прысвоена 15 млн рублёў. Усіх злоўжыванняў Надзеі Таўкшанавай у "Лаўрэнаўцы" не пералічыць.

Не адставаў ад яе і Каклашвілі. "Джыгіт" адчуваў сябе так упэўнена, што дазваляў сабе па-хамску ставіцца да рабочых і спецыялістаў, зневажаць жанчын, брыдкасловіць у прысутнасці старых і падлеткаў. Нездарма ў народзе яму прыдумалі мянушку "каўказскі тэрарыст". Словам, у Надзеі Таўкшанавай быў дастойны падзельнік. Па ягонай просьбе галоўная бухгалтарка, якая мела ў СВК вялікую ўладу, залічыла на працу брата старшыні, асуджанага да папраўчых работ з утрыманнем часткі заробку. Брат Цімура Каклашвілі нідзе не працаваў, але на паперах лічыўся работнікам СВК "Лаўрэнаўка" і штомесяц атрымліваў у касе кааператыву па 350 тысяч рублёў.

Калі над раскрадальнікамі навісла пагроза пакарання, Каклашвілі ўзгадаў, відаць, каўказскі звычай выкрадання нявесты. Выкраў ён, праўда, не нявесту, а шэраговую супрацоўніцу бухгалтэрыі сваёй гаспадаркі. Пасланыя старшынёй "абрэкі" з тутэйшых схапілі няшчасную жанчыну на вясковай вуліцы, заштурхалі ў машыну, дзе ўжо чакаў яе Каклашвілі. Потым жанчыну з завязанымі вачыма адвезлі ў лес, дзе збівалі і вымушалі даваць следчым тыя паказанні, якія патрэбныя для Цімура Каклашвілі і Надзеі Таўкшанавай.

Цікава, што, назначыўшы каўказскага "ворага" кіраўніком гаспадаркі, раённая ўлада ніводнага разу не пацікавілася ў жыхароў Лаўрэнаўкі, як імі кіруе Цімур Каклашвілі. Калі б у СВК пабывала хоць бы адна рэвізія, яна б адразу ўбачыла парушэнне закону ў тым, што галоўная бухгалтарка сумяшчае гэтую пасаду з працай касіра. Забараніўшы гэтае злачыннае сумяшчэнне, рэвізоры спынілі б цэлую чараду крадзяжоў. Але ні афіцыйныя асобы не зважалі на дзейнасць кіраўніцтва СВК, ні самі тутэйшыя ніводнага разу не паспрабавалі пярэчыць свайму начальству. Не знайшлося ў Лаўрэнаўцы і звычайнага для нашых вёсак праўдашукальніка, "гарлапана", "пісакі", з сігналаў якога часцяком пачынаюцца расследаванні буйных крадзяжоў.

Тое, што не зрабілі раённыя рэвізоры, давялося рабіць следчым РАУС і суду Талачынскага раёна. Цімур Каклашвілі і Надзея Таўкшанава асуджаны адпаведна на 6 і 5 год зняволення з канфіскацыяй маёмасці і забаронай надалей займаць матэрыяльна адказныя пасады.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 ЛІПЕНЯ 2007 г.

ДИСКУССИЯ

Господа офицеры!

Хватит плакаться...

Уважаемый подполковник в отставке Александр Курлович!

Прочла Вашу слезную заметку о тяжкой доле военнослужащих (№№103-104) и хочу Вам напомнить, что после войны вся Беларусь была в беде: разруха, сожженные дотла деревни (многие так и не восстановились). Сгорело все, так что землянку нечем было выкопать. А во многих деревнях и некому было рыть землянки, гитлеровцы сожгли людей вместе с домами. Это невозможно забыть! Как и то, что оставшиеся в живых не жалели сил, чтобы все восстановить.

Молодежь стремилась кто на стройку, кто к станку, на поднимаемые из руин заводы, шли учиться в ПТУ, техникумы, институты... Студенты голодали и, чтобы выжить, ходили по ночам разгружать вагоны. Если из дому удавалось привезти кусок сала — это было счастьем! Да и домой-то часто было не поехать, ведь автобусов и даже попутных машин не было.

Да, многие, как и Вы, Александр, поступали в военные училища — в соответствии со своими стремлениями и возможностями. Но представьте себе, что все (или большинство) захотели бы стать военными — кто бы их кормил, поил, содержал огромную армию? Что же упрекать тех, у кого, по-вашему, не хватило ума-разума ступить на армейскую стезю? Не забывайте и то, что тем, кто остался в выгоревших деревнях, в сталинские времена вырваться в город было практически невозможно — крестьянам ведь, как крепостным, не выдавались паспорта.

Всем, не только вашей семье, было трудно. Но военные люди всегда, насколько было можно, в первую очередь обеспечивались материально. Даже тогда к их услугам были военторги. А гражданские, в том числе и те, кто выращивал хлеб, стояли до обмороков в бесконечных очередях за тем же хлебом, ситцем...

Известно и то, что если армейская служба проходила на Севере или Дальнем Востоке, то применялся коэффициент, и год службы засчитывался за 1,5 и 2 года. До 60-х годов и ГДР было местом службы, за которое применялся коэффициент.

Правда, многим военным приходилось переезжать довольно часто с места на место. Но ведь контейнеры для перевозки предоставлялись бесплатно, так же, как и сама перевозка к новому месту назначения. А уж на грузчиков вы, господа военные, никогда не тратились — бесплатная рабсила (солдаты) всегда была под рукой. Известно ведь, что и коттеджи для многих строили бесплатно солдаты, хотя это не влезало ни в какие рамки. В отпуск вся семья ехала бесплатно через весь Союз... Многие военные, поколесив по Союзу, попадали за границу и за 2 года (а иные жили там 5 и более лет) приобретали себе добротную мебель, ковры, хрусталь, посуду, одежду, обувь на всю оставшуюся жизнь. А в Союзе это был страшный дефицит!

При выводе войск из ГДР и других стран Варшавского договора многие "бедные" военные не стеснялись продавать тем же немцам военное имущество (шинели, сапоги, одеяла, военную технику и запчасти к ней. Не брезговали даже продажей стеклотары). Все государственное шло за бесценок, а кто в суматохе проверит? Да и смотрело на это армейское начальство сквозь пальцы.

Оттуда, с "гнилого Запада", везли спутниковые антенны, швейные машинки, пылесосы, компьютеры, легковые автомобили и многое другое. (Провоз же бесплатный!) Везли целыми контейнерами, так что и внукам хватило.

Мало того: в этой шумихе части меняли свою дислокацию, и тут многие военные вдруг оказались "бесквартирными", утаив, что у них есть квартира то ли в Ростове, то ли в Конотопе. Но возвращаться в "дыру" — упаси Бог. И за совсем короткий период — от полугода до 3 лет — несчастные "бездомные" получили бесплатные квартиры в Минске, Витебске, Могилеве, Полоцке и других городах гостеприимной синеокой Беларуси (свои собственные квартиры в других краях Союза продали). Еще бы, Беларусь, особенно Минск, — это же класс! Микрорайон "Малиновка", например, на 90% состоит из квартир отставников, военных, ушедших в 45 лет в отставку — молодых, здоровых. Получают себе пенсию в 1,2 млн рублей и притом работают всяческими начальниками на госпредприятиях, в охране, фирмах разных, получая еще столько же, а то и больше своей пенсии. Многие открыли клубы игровых автоматов, интернет-клубы, занимаются прибыльным бизнесом. Как говорится, на здоровье — я говорю это не из зависти, — но разве подобные возможности есть у гражданских?..

Известно, что вся военно-оборонная система финансируется из госбюджета. А вот откуда туда поступают средства, Вы, уважаемый подполковник, очевидно, не знаете или не хотите знать? Так я все же посмею напомнить, что ваш ровесник-колхозник получал жалкие копейки за изнуряющий труд ради того, чтобы обеспечивать всем необходимым огромнейшую армию огромной тогда страны. Рабочий у станка, водитель, учитель, ученый — все гражданское население — платили солидный подоходный налог, львиная доля которого шла на военные цели.

Уйдя в отставку в расцвете жизненных сил, военные получают в 3—4 раза пенсию выше, чем водитель, профессор, рядовой чиновник, ушедший на пенсию в 60. (Кстати, в переводе на военное звание я имела бы чин подполковника, но пенсия у меня, как у всех — 320 тысяч рублей.) От пенсии, после погашения коммунальных платежей, на все про все остается только 200 тысяч. А ведь кроме неизбежной покупки все дорожающих продуктов и лекарств не остается почти ничего...

Фруктов я почти не покупаю, а вот без элементарных предметов гигиены (о приобретении каких-то "серьезных" вещей, одежды тут и не думаешь) никак не обойтись. Да еще нормальному человеку надо ведь и в театр сходить, и на выставку. Кстати, за льготный (!) билет для пенсионера в Национальный художественный музей, чтобы посмотреть картины из Третьяковки, требовалось выложить 10 тысяч рублей! И это я, как и многие другие, заслужили за беспрерывный 40-летний стаж честной работы! Подскажите, Александр, как нам жить-выживать в такой ситуации? Или мы люди второго, а может, даже третьего сорта, как будто и не работали на страну, а где-то в канаве валялись?

...После смерти мужей-военных их неработавшие и работавшие жены получают пенсию по потере кормильца большую, чем я со своим 40-летним беспрерывным стажем. Больше, чем фельдшер с 45-летним медицинским стажем, отработавший в глухой деревне, где даже велосипеда не выдавали на вызов: 7—15 км — все ножками... А больничная няня, санитарка за 178 часов работы в месяц что зарабатывает?

И детки ваши, господа военные, к счастью, не бедствовали и не бедствуют: в школе лучше всех были одеты и сейчас все устроены хорошо: кто в коммерции, а кто и за границей. Все у них в порядке и с заработком, и с жильем, не то что у "мирных" инвалидов, да и просто пенсионеров.

С того момента, когда белорусские военные стали служить на родине (если же их и забрасывает в далекие горячие точки погоня за большими контрактными деньгами — это их дело), то где же, спрашивается, они так настрадались — в Уручье, Мачулищах, Борисове, Бресте, Барановичах, Боровом, Балбасове, Березе и других уголках Беларуси?

Вот я и хочу обратить внимание нашего правительства на неоправданную, по-моему, разницу в подходе к пенсионному обеспечению военных и гражданских лиц. Не о каких-то льготах говорю, а об уравнивании принципа исчисления пенсий. Все равно у военных, в связи с более высокими зарплатами, она будет выше, чем у нас. И пусть, это будет только справедливо. Но не терпеть же и дальше такой огромный разрыв? А может, настала (я уверена, что настала) пора увеличить срок службы военным до 50—55 лет (высшим чинам). А при том, что пенсионер-военный еще и работает, подумать, что ему должно быть выгоднее: работать или получать пенсию. Таким образом сэкономятся немалые бюджетные средства, так необходимые государству, стране. Они очень нужны на воспитание детей, социальные и культурные нужды. Под силу ли нам содержать на таком уровне армию, молодых военных пенсионеров?.. Необходимо решить этот злободневный вопрос, чтобы не росло недовольство среди гражданского населения, которое можно понять.

Господа военные! Перестаньте плакаться! Будьте офицерами, мужчинами, в конце концов.

P.S. Ни в коем случае я не хочу обидеть настоящих защитников Отечества, людей чести. Спасибо им за ратный труд. Но быт и нравы военных я хорошо знаю, так как выросла в городке, где было много воинских частей, да и общаться мне пришлось с их женами, вечно чем-то недовольными. Однако поменяться местами с нами, простыми смертными, они бы ни за что не согласились...

Раиса ГУРИНОВИЧ,
минчанка.

ПАРАЛЕЛІ

А каму — Камю...

Усё ж адказы на журналісцкія пытанні праз Інтэрнет — рэч небяспечная: клавішы націскаць так лёгка. Асабліва гэта рызыкоўна для чалавека, звычнага спачатку фразу сабраць па слоўку на паперы, каб прыгледзецца да яе, асэнсоўваючы-рэдагуючы, а ўжо потым няспешліва перапісаць "па-беларуску". Але ж Уладзімір Колас, філолаг з вышэйшай адукацыяй, кінарэжысёр, вядомы грамадскі дзеяч і звычны і пісаць любыя тэксты, і выразна-дакладна агучваць свае думкі ў публічных выступленнях. Так што, відаць, ягоны інтэрнетны адказ адноўленай і з розумам абноўленай газеце "Свабода" (на вялікі жаль, практычна інтэрнетнай, маладасягальнай для паспалітага чытача — накшталт аўтара гэтых радкоў), мяркую — не паспешлівая імправізацыя, а вынік цвёрдага перакананння. Што ж, шчырасць можна толькі вітаць. Але калі ўлічыць, што гэта — публічная шчырасць аднаго з відных дзеячаў нашай беларускай інтэлігенцыі, то па меншай меры ўзнікае, скажам так, пачуццё збянтэжанасці.

Нагадаю, "Свабода" (№25, 2007) запыталася ў сваіх чытачоў: *"Якога беларускага культурніцкага прадукту вам не хапае найбольш?"* Адказы прыйшлі ад розных людзей — ад студэнта і хатняй гаспадыні да літаратурнага крытыка і філосафа. Філосафа Валянціна Акудовіча працытую асобна. Вось гэта хаця б: *"... не хапае беларускамоўнага тэлебачання... беларускага кіно, якое б рабілася праз беларускую ментальнасць... тэатра беларускага... Калі думаць пра сучасную нацыю, у нас паўсюль адны дзіркі і прарэхі..."*

Цяпер Уладзімір Колас. Яму *"ўсяго нестае. А больш за ўсё — добрага рамана. Кшталту "Чужаніцы". Чытаю па-расейску, на вялікі жаль. Не маю добрай сучаснай белетрыстыкі па-беларуску. Можа, параіце што? Не наталяюць гэтай прагі нашы аўтары. Хацелася б, каб гэта адпавядала маім сціплым густам..."*

Ну, перш-наперш "адказчык" так, відаць, "ужыўся" ў французскую літаратуру, што нават палічыў непатрэбным назваць аўтара "Чужаніцы" — нобелеўскага лаўрэата Альбера Камю. Па-другое, здзіўляе, што, добра ведаючы французскую мову, Уладзімір Колас чытае твор не ў арыгінале, а ў рускім перакладзе. А мо і ўсё іншае шаноўны "адказчык" чытае па-руску?

Што да "Чужаніцы", то гэтая рэч працяглы час мае ўстойлівую папулярнасць у Францыі. Праўда, тамтэйшыя літаратурныя крытыкі, здаецца, абышлі ўвагай тую акалічнасць, што гэта раман пра француза, які нарадзіўся і жыве ў Алжыры (забраным Францыяй, пераўтвораным ёю ў свой "заморскі дэпартамент"), але так і не адчуў сябе "алжырцам". Герой твора Мерсо чужы па светаўспрыманні і звычаях карэнным жыхарам афрыканскай краіны, ставіцца да іх грэбліва-варожа і ўрэшце проста так ("сонца ўдарыла ў галаву") забівае "араба" (насамрэч алжырца), за што і трапляе пад суд...

Аўтар рамана Альбер Камю — француз, які таксама, падобна персанажу свайго твора, нарадзіўся ў Алжыры, там вучыўся, потым перабраўся ў Парыж (чаго не захацеў ягоны Мерсо), стаў знакамітым пісьменнікам, патрыётам Францыі, але ў яго філасофіі так і застаецца пэўная духоўная раздвоенасць, "сяродземнаморскасць".

Вельмі зразумела, чаму беларускі інтэлігент у захапленні ад знакавага твора знакамітага француза: нешта падобнае па духоўным настроі пануе зараз і ў нас, у Беларусі. Тым не менш: ці можна стварыць, нават маючы добрыя літаратурныя здольнасці, у нас, нешта адэкватнае "Чужаніцы"? Адназначна — не. У той жа час асэнсаванне згаданага працэсу, калі людзі, нарадзіўшыся ў Беларусі, становяцца чужаніцамі ёй і нават разбураюць яе на карысць іншага народа, а другія, наадварот, асімілююцца, каб урэшце ўліцца ў духоўную стыхію яе этнасу, — гэтая з'ява рэальная, яна знаходзіць увасабленне ў творах беларускіх літаратараў.

Калі на тое, то хай гэта і нясціпла, але магу прапанаваць увазе свой раман "Алжырская пастка". Гэта зусім не азначае, што ўсё сваё трэба хваліць — крытычны разбор вельмі патрэбны. Галоўнае, дзеля развіцця народнага, дзеля выжывання ў свеце як нацыі нашым інтэлігентам даўно пара ўдумна чытаць не толькі Камю, а і беларускую белетрыстыку. Абмяркоўваць яе, аналізаваць, пісаць пра яе. І выказвацца пра творы канкрэтна. А не так, як бывае цяпер, калі на пытанне да інтэлігентаў, што яны апошнім часам беларускае чыталі, адказваюць амаль аднатыпна: згадваюцца хіба што Купала, Быкаў, Караткевіч... Гэта само сабою зразумела. А далей? Вось нядаўна пытаюся ў аднаго паважанага грамадскага дзеяча пра яго ўражанне ад сучаснага беларускага рамана і чую ў адказ шчырае: "Ляжыць на чарзе". А ў "чарзе" называе кнігі, якія ўвогуле выйшлі гады тры-чатыры таму. Канешне, каму чытаць — Камю, а каму што іншае, кожны сам вырашае. Але... Не памятаю выпадку, каб нейкі новы літаратурны твор, тэатральную пастаноўку, кінафільм абмяркоўваўся Радай інтэлігенцыі, хоць каму як не ёй задаваць тон, высока трымаць планку духоўнага ўзроўню грамадства. Больш жа і няма ўжо каму: чынавенства ў нас стала амаль спрэс "чужаніцамі", Саюз пісьменнікаў развалены, Саюз кінематаграфістаў курчыцца ў агоніі, тэатралы пяюць хвалу ўладнаму рэжыму... Хто яшчэ? Але ж беларускі народ яшчэ жывы і жыць прагне. І на дварэ ўжо не 1937 год, а 2007-ы.

Эрнест ЯЛУГІН,
пісьменнік.

ЕСТЬ ВОПРОС...

Какие заболевания дают право на дополнительную площадь при получении или строительстве жилья?

С таким вопросом в редакцию обратилась Ольга Николаевна Шимакова.

Перечень заболеваний, дающих лицам, страдающим ими, право на получение дополнительной площади жилого помещения, утвержден постановлением Министерства здравоохранения от 19.04.2001 г. №27. Получив у юристов этот документ, мы выяснили, что в список входят:

— отдаленные последствия (после 12 месяцев лечения) заболеваний и травм центральной нервной системы со стойкими резко выраженными нарушениями двигательной функции двух и более конечностей (последствия острых нарушений мозгового кровообращения, энцефаломиелитов, болезни Гентингтона, спинальных мышечных атрофий, наследственных атаксий, рассеянного склероза, мышечных дистрофий, миопатий, детского церебрального паралича, гепатоцеребральной дегенерации, тяжелой черепно-мозговой травмы, травм позвоночника и спинного мозга, новообразований головного и спинного мозга);

— дилятационная кардиомиопатия с выраженной сердечной недостаточностью;

— активные формы туберкулеза, подтвержденные клинико-лабораторными или иными методами исследования, с бактериовыделением при условии соблюдения больными предписанного режима лечения и сохранения выделения микобактерий после проведенного шестимесячного курса противотуберкулезного лечения;

— психические расстройства (заболевания) с хроническим течением, с тяжелыми стойкими и часто обостряющимися болезненными проявлениями и выраженными расстройствами личности: шизофрения; хронические бредовые расстройства; органическое бредовое (шизофреноподобное) расстройство; деменция любого генеза; расстройство личности в связи с эпилепсией; умеренная, тяжелая и глубокая умственная отсталость;

— кожные болезни: распространенные формы пузырчатых дерматозов; генерализованные поражения кожи при коллагенозах;

— каловые, мочевые и влагалищные свищи, стома мочевого пузыря, энтероколостомы и тонкокишечные свищи;

— проказа, озена;

— бактерионосительство брюшного тифа.

РУБАМ!

Дык дзе ж тыя рэцэпты?

Упершыню пішу ў "Народную волю" і ўпершыню — па-беларуску. Справа ў тым, што доўгі час давялося жыць у Расіі. Але, хаця і ўладкаваўся там някепска, ды ўвесь час цягнула на Радзіму, да сваіх каранёў...

Як прыемна было пачуць у вёсцы маю родную мову, асабліва з вуснаў малых дзетак з садка — тое былі першыя гады ўзнаўлення незалежнасці Беларусі.

Але ў хуткім часе гэта скончылася — і беларускамоўныя садкі і школы, і ўздым беларускага адраджэнцкага духу. Манкурты вырашылі, а бальшыня моўчкі пагадзілася, што быццам на сваёй мове нельга выказаць нічога значнага — і перайшла пераважна на трасянку, бо чужой мовай, не ведаючы сваю, ніколі дасканала не авалодаеш. Ну, а значная частка інтэлігенцыі, нават валодаючы роднай, трымае нос па ветры і шпарыць па-руску...

Змірыцца з гэтым цяжка, нават немагчыма. Ці ж можа быць Беларусь без беларускага слова — асновы ўсёй дзяржаўнай будовы? Адна фікцыя, фармальная геаграфічная назва...

Лічу, што кожнае слова па-беларуску — гэта няхай сабе маленькі, але неабходны крок да незалежнай, вольнай, шчаслівай Бацькаўшчыны, выхаванне яе адданых, свядомых дачок і сыноў. І я кажу шчыры дзякуй і нізка кланяюся да зямлі такім непахісным, таленавітым змагарам за беларушчыну, за светлую долю народа, як народны паэт Ніл Гілевіч, кампазітар Алесь Рашчынскі, мастак Аляксей Марачкін, "галоўны ліцэіст" Уладзімір Колас, рэжысёр Валер Мазынскі і шмат хто іншы. Рады, што нарэшце па-беларуску пачаў пісаць у "Народнай волі" філосаф Вячаслаў Оргіш, у яго гэта добра атрымліваецца.

Але ў цэлым (нават мне са сваёй глыбінкі відаць) становішча проста бядотнае. Уся сур'ёзнасць і глыбіня сказанага Нілам Сымонавічам "няма мовы — няма дзяржавы" ніяк не даходзіць ні да вярхоў, ні да нізоў, як і да бальшыні нашых апазіцыянераў. Ці не таму іх планы, праграмы, жаданні так і не спраўдзіліся, што ўпускаецца галоўнае, фундаментальнае?

Ні спрэчкі напярэдадні Кангрэса дэмсіл, ні падчас яго, ні пасля гэтае галоўнае пытанне не толькі не вырашылі, а па сутнасці нават не закраналі. Галоўнае ж, што хвалявала і, па ўсім відаць, хвалюе і зараз апазіцыйных правадыроў, — хто будзе трымаць самы тоўсты партфель, кіраваць бясконцым працэсам млявых і бессэнсоўных, на мой погляд, разважанняў пра ўсялякія міражы — напрыклад, перамовы з уладай (якім ніколі не быць), удзел у выбарах (якім насамрэч няма і без кардынальных змен у выбарчым кодэксе не будзе)... Словам, тыя, хто лічыць сябе перадавой часткай грамадства і павінен быць каталізатарам перамен, па сутнасці пляцецца ў хвасце падзей і ніяк на іх не ўплывае. Адна надзея і радасць — мужная і разумная моладзь, якая, хочацца верыць, не згубіць свой жывы патэнцыял у абароне незалежнасці і дэмакратычнай перспектывы беларускай Беларусі.

...Кажу тое, што выказвалі ўжо многія, і не ўзяўся б за пяро, каб не прачытаў у №№79—80 заклік П.Кісляка "Не спазніцеся!". У соты раз аўтар таўчэ ваду ў ступе, прыняўшы позу ўсяведа ў пытанні, якое хвалюе ўсіх: што рабіць, каб павярнуць жыццё да лепшага? Ён называе неабходнае і ўсім вядомае: трэба мяняць выбарчы кодэкс, прарываць дэмсілам інфармацыйную блакаду і г.д. А хто, скажыце, супраць гэтага, акрамя, зразумела, сённяшніх улад? Ды ніхто. А вось як гэта зрабіць, адказу ці хаця б спробы знайсці яго няма.

П.Кісель піша, што *"ёсць нямала магчымасцяў, каб прымусіць улады пайсці насустрач"* — значыцца, ён ведае гэтыя магчымасці? Дык чаму ж не назаве хоць бы адну — ужо быў бы прарыў! А то ўсе б'юцца лбамі, дайсці да толку не могуць. Аднак вось Кісляк ведае, ды маўчыць...

А што значыць *"трэба рубам ставіць пытанне аб разблакіраванні тэлебачання, радыё, недзяржаўных газет"?* Навошта трымаць сакрэт, як гэтага дабіцца, пры сабе?

Карацей, лічу больш прадуктыўным прызнаць, што сумленны чалавек, сапраўдны грамадзянін перш за ўсё павінен ставіць пытанне перад самім сабой: што я магу зрабіць для Беларусі? Ужо сёння, зараз, не чакаючы пустых парад розных балбатуноў, не назіраючы збоку, як маладых, не згодных маўчаць патрыётаў малоцяць міліцэйскімі дубінкамі, кідаюць за краты, выганяюць з работы і вучобы. А магу я, аказваецца, не так і мала, хаця на першы погляд не скажу нічога "р-рэвалюцыйнага". Проста трэба трымаць у сэрцы і на вуснах роднае слова, перадаваць яго як каштоўнейшы дар дзецям і ўнукам, гуртаваць вакол сябе аднадумцаў, абуджаць тых, хто ўпаў у спячку. З асобных адзінак складзецца вялікая грамада, і разам мы зможам многае. І самае запаветнае — наблізіць тую светлую, прыгожую, беларускую Беларусь, аб якой зараз толькі марым.

Вось такі мой просты, зусім просты *"рэцэпт"*, даступны абсалютна ўсім.

Міхаіл ДУБОВІК,
жыхар в.Каўняцін Пінскага раёна.

РЭХА

Будзе жыць вечна!

Прачытаў у "Народнай волі" ліст Ніны Багінскай "Ніхто не здолее запляміць наш Сцяг, нават тыя, хто запіхвае яго ў сметніцу", і ён закрануў за жывое. Хочацца ўсімі сіламі душы падтрымаць патрыётку Беларусі ў змаганні і веры ў нашы асвечаныя кроўю продкаў святыні, сімвалы Бацькаўшчыны — бел-чырвона-белы сцяг і герб Пагоня.

Я многа разоў углядаўся ў фатаграфію ў "Народнай волі", дзе постаць танклявай, але нязломнай духам жанчыны са сцягам у руках — перад сцяной амбалаў у форме, якім усё роўна, каго біць, каго зневажаць, абы быў загад ды добра плацілі. Ды яны аказаліся бяссільныя перад жанчынай са сцягам, які лунае на фоне неба і белага Хрыстова храма. Адзінокая, але бясстрашная жанчына нібы і не заўважае тых, хто перагарадзіў ёй дарогу да Храма, бо ведае: боскае пераможа нялюдскасць на нашай зямлі!

Пераможа, бо гэта толькі на здымку яна адна. Разам з ёю па ўсёй краіне — тысячы і тысячы такіх жа патрыётаў, якіх гуртуе наш святы Сцяг, як гуртаваў нашых гераічных прашчураў, што клалі жыцці за Айчыну. Восем стагоддзяў пад гэтым сцягам яны змагаліся, баранілі сваю зямлю і свой гонар. І сёння ўсё больш моладзі новага пакалення — юныя калінаўцы — бяруць гэты сцяг, беларускую Нацыянальную ідэю ў свае сэрцы. Яны хочуць быць свабоднымі і шчаслівымі ў свабоднай і шчаслівай краіне, і ніхто, ніякія перашкоды і ўціск, дубінкі і турэмныя краты не загародзяць ім дарогу да Будучыні. І наша Беларусь будзе жыць вечна!

Мікола КУКСО,
жыхар г.п.Івянец Валожынскага раёна.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 ЛІПЕНЯ 2007 г.

ВЗГЛЯД ИЗ ЯПОНИИ

Ядерная энергетика: надежды и страхи

Япония — единственная страна мира, которая подверглась полномасштабной ядерной атаке и которая понесла огромные человеческие потери в результате радиоактивного заражения.

Поэтому странным кажется такая приверженность Японии атомной энергетике: в стране действует больше ядерных реакторов, чем в любом другом государстве, кроме США и Франции. А еще более странным это кажется в свете часто происходящих в Японии природных катаклизмов, таких как землетрясения.

Бывший корреспондент Би-Би-Си в Токио Джонатан Хэд пытается разобраться, чему учит опыт Япония в области ядерной программы энергетики.

Несмотря на болезненность вопроса атомной энергии для японского общества после бомбардировок Хиросимы и Нагасаки, Японию всегда сильно волновал еще один вопрос — отсутствие на территории страны энергоресурсов.

Если не принимать во внимание ряд мелких проектов использования геотермальных электростанций, других основных источников энергии в стране нет: речь идет об отсутствии нефти и очень небольших запасах угля.

Отчасти именно желание Японии обеспечить надежные энергетические поставки стало одной из причин военной экспансии Токио в Азии в 1930-х — 1940-х годах.

Поэтому когда в 1950-х годах США начали кампанию под лозунгом "Атом в мирных целях", Япония — к тому моменту верный союзник Вашингтона в холодной войне — с готовностью к ней присоединилась.

Вера в инженеров

Размах строительства атомных станций достиг максимальных масштабов в 1970—1980-х годах — в тот период, когда подгоняемая растущим экспортом японская промышленность развивалась огромными темпами.

1991 год. Снежань. У паляўнічым домику ў Віскулях, размешчаных у Белавежскай пушчы, падпісваюцца дакументы, паводле якіх з карты свету аднамомантна знікае вялізная супердзяржава пад назваю СССР. Вакол падзей снежня 1991 года ў Віскулях склалася шмат даволі сумніўных стэрэатыпаў, якія з цягам часу не развейваюцца, а наадварот, абрастаюць яшчэ большым друзам усемагчымых домыслаў і легенд. Самая папулярная, напрыклад, сведчыць пра тое, як "тры белавежскія зубры" — Ельцын, Краўчук і Шушкевіч — росчыркамі сваіх "паркераў" развалілі СССР. Гэткія звышмагутныя Тытаны, што ў імгненне вока парушылі трываласць і моц супердзяржавы... Канечне, суб'ектыўны фактар уплыву на ход гісторыі заўсёды значны. Але ці настолькі?..

Успаміны вядомага палітыка Георгія Станіслававіча Таразевіча пра падзеі, звязаныя з Віскулямі, якраз шмат што высвятляюць у гэтым плане. Апроч таго, яны, на наш погляд, добра перадаюць саму атмасферу таго драматычнага снежня, які істотна "скарэкціраваў" лёсы многіх дзесяткаў мільёнаў чалавек...

Хто вінаваты?

— Георгій Станіслававіч! Дык хто ўсё ж такі разваліў Саюз? Чаму ён рухнуў так хутка? Хіба кіраўніцтва краіны не бачыла такой змрочнай перспектывы і той жа Гарбачоў не адчуваў, што ён ужо не валодае становішчам? Няўжо ён не ведаў, урэшце, што за ягонай спінай рыхтуецца віскулёўская сустрэча?

— На пытанні з цыклу "Хто вінаваты?" заўсёды адказваць прасцей, чым на пытанні "Што рабіць?". Але я прычыняюся да тых, хто лічыць, што роля асобы ў пэўных гістарычных абставінах часам бывае не меншая, чымсьці важныя аб"ектыўныя моманты. Згадайма таго ж Лук'янава, пра ролю якога я ўжо казаў у адной з мінулых гутарак. Ён, паўтаруся, быў, на мой погляд, адным з самых чорных людзей гарбачоўскага акружэння і ў сілу розных прычын нямала зрабіў для расхіставання сістэмы. А цяпер ён — штатны расійскі парламентарый і лічыцца адным з самых артадаксальных "патрыётаў" на расійскай палітычнай сцэне. Я лічу, што пры ўсялякім раскладзе *"краіна павінна ведаць сваіх герояў"*.

Што ж да Гарбачова, то ён ведаў пра магчымую сустрэчу ў Віскулях. Незадоўга да тых снежаньскіх падзей я папярэджваў яго пра гэта ...

— ???

— Гэта было дзесьці ў кастрычніку 1991 года. Толькі што быў выбраны старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч. Я тады, як вядома, працаваў у Маскве, але на выхадныя рэгулярна прыязджаў дадому, у Мінск. У адзін з такіх выхадных Шушкевіч патэлефанаваў мне на кватэру і запрасіў да сябе ў Вярхоўны Савет на размову. Напачатку ён папрасіў мяне ахарактарызаваць апарат нашага беларускага Вярхоўнага Савета. Я дэталёва распавёў яму — хто ёсць хто. Шушкевіч пацікавіўся маім меркаваннем наконт магчымага пераезду Вярхоўнага Савета з Дома ўрада ў будынак былога ЦК. Я адказаў, што гэтага не варта рабіць, а параіў аддаць гэты будынак БДУ. Вам, — кажу, — і месца ў Доме ўрада з галавою хопіць. Чым большы будзе будынак, тым большы будзе апарат. Шушкевіч паабяцаў падумаць на гэты конт. (І, дарэчы, на жаль, не прыслухаўся да майго меркавання.) І вось напрыканцы нашай размовы ён раптам пытаецца: "А што, калі я запрашу Ельцына на паляванне ў Белавежскую пушчу?".

— Выходзіць, Станіслаў Станіслававіч ужо тады спаў і думаў, як разваліць СССР?..

— Я перакананы, што Шушкевіч тады нават і не падазраваў, што можа за гэтым паследаваць. Ён проста хацеў бліжэй пазнаёміцца са сваім калегам — кіраўніком найбольшай саюзнай рэспублікі, які стаў пасля жнівеньскага путчу надзвычай папулярным і ўплывовым. Я не знайшоў тады ў гэтай ідэі нічога крамольнага і адказаў: "Чаму ж не?.."

Праз, можа, яшчэ які тыдзень Шушкевіч ізноў мяне запрашае ў свой службовы кабінет і адразу ў лоб пытаецца: "А што, калі я яшчэ і Краўчука ў пушчу запрашу?" Я яму тут жа адказваю, што гэтага катэгарычна нельга рабіць. Што сам факт такой сустрэчы будзе выглядаць для азіяцкіх рэспублік Саюза змовай... А ён мне: "А я ўжо запрасіў!.." Кажу, што гэта вельмі дрэнна, і настойліва раю неяк ануляваць запрашэнне. Шушкевіч толькі рукамі развёў...

Пасля гэтай размовы ў мяне з"явілася на душы нейкае трывожнае прадчуванне. Я не прарок і, зразумела, не ведаў, што ў Віскулях падчас палявання на вепрукоў трох лідэраў саюзных рэспублік будзе мімаходзь дэнансаваны Саюзны дагавор і СССР знікне як дадзенасць. Але інтуітыўна адчуваў, што дабром гэтая сустрэча не скончыцца...

«Все хорошо, прекрасная маркиза!»

— Дзесьці за тыдзень да Віскулёў я прыляцеў у Маскву і адразу да Гарбачова. І распавёў яму, што ў Белавежы плануецца, на мой погляд, даволі небяспечная сустрэча...

— І як Гарбачоў успрыняў гэтую інфармацыю?

— Гарбачоў быў верны сабе. Ён мне адказаў так: "Што ты мяне палохаеш, ці першы раз яны між сабою стасуюцца. Хай сабе на выхадныя пап'юць у пушчы гарэлкі, трохі развеюцца ад спраў надзённых. У панядзелак яны ўсе, як агурочкі, будуць у мяне ў Новаагарова на чарговым абмеркаванні новага саюзнага дагавора..." Усе мае спробы яго зацікавіць гэтай інфармацыяй не далі выніку. З тым я і пайшоў...

— Кажуць, што Шушкевіч запрашаў на вепрукоў і Назарбаева?..

— Так... Але той даляцеў толькі да Масквы і там спыніўся. Ён відаць, адчуваў, што ў Беларусі пахне паленым і далей не паляцеў. Але, паўтараю, Шушкевіч і сам, безумоўна, не ведаў, чым абернецца тое паляванне.

— Дык хто ж усё такі насамрэч быў "бацькам" віскулёўскай ідэі, адкуль рожкі раслі?

— Наўрад ці варта тут шукаць нейкія звышкаварныя "происки" ворагаў. Болей за тое, наўрад ці быў нейкі персанальны аўтар гэтай ідэі... Мяркую, што ў тых вірлівых гістарычных абставінах яна нарадзілася хутчэй за ўсё спантанна. А вось галоўным яе каталізатарам, безумоўна, быў Бурбуліс, тады найбліжэйшы дарадца Ельцына. Думаю, што і непасрэдная прычына Віскулёў была самая празаічная... Пасля геройскага жніўня Барысу Ельцыну, як вядомай бабулі з пушкінскай казкі пра рыбака і рыбку, ужо было мала той улады, якой ён валодаў. Яму захацелася большага — правіць Расіяй "самодержавно", без ніякай "надстройки". І такія як Бурбуліс, я перакананы, былі не болей чым рэалізатары ягоных таемных жаданняў. Ды яму самому — нікому не вядомаму дасюль дацэнту са Свярдлоўска — відаць, вельмі карцела дакрануцца да неабмежаванай улады, паспрабаваць яе на смак. Згадзіцеся, надзвычай спакуслівае жаданне, якому цяжка супрацьстаяць. А для гэтага ўсе сродкі добрыя...

— Зноў той самы суб'ектыўны фактар?

— Безумоўна. Якімі б важкімі ні былі аб'ектыўныя прычыны, мы не можам не ўлічваць ролі той "абоймы" палітыкаў, што былі ў акружэнні Гарбачова і Ельцына. Асабліва апошніх. Я скажу, магчыма, спрэчную рэч, але мне здаецца, што людзі з надзвычай стракатага акружэння былога першага сакратара Свярдлоўскага абкама, так званы "свярдлоўскі клан", пасля жнівеньскага путчу крыху ашалелі ад нечаканага нахлынуўшай на іх улады, вядомасці, уплывовасці. Урэшце, ад прадчування яшчэ большай, неабмежаванай улады, да якой трэба было толькі працягнуць руку... Таму яны не вельмі добра ўсведамлялі, што робяць, наўрад ці добра разумелі, якія могуць быць наступствы і вынікі таго палітычнага пасьянса, што меркавалася раскінуць у Віскулях. Ды і што яны ўвогуле ставілі на карту ў тыя снежаньскія дні? Амаль як у Бібліі: "Ибо не ведают, что творят..." Так гэта ці не так, але яны бліскуча сыгралі на непамерных амбіцыях Барыса Ельцына, прынамсі "падагрэлі" іх да належнага стану. У выніку ў паляўнічым дамку, размешчаным у адной з прыгажэйшых мясцін Беларусі, вялікай краіне быў падпісаны канчатковы прысуд.

Союз «нерушимый...»?

— Значыць, не такая яна была і вялікая, гэтая краіна, калі так лёгка была зліквідавана?..

— Па сваіх магчымасцях, патэнцыяле і ўплыве на сусветны парадак СССР насамрэч быў вялікай і магутнай краінай. Нездарма яго разам з ЗША кітайцы адносілі да так званых сусветных "гегемонаў"-супердзяржаў. Іншая справа, што магутнасць СССР была істотна падарваная, і асабліва ў апошнія гады негатыўнымі ўнутранымі працэсамі.

— Пра тыя працэсы мы яшчэ пагаворым... Давайце вернемся да акружэння Ельцына. Няўжо яны насамрэч былі такімі ўжо "роковыми" зладзеямі, што спалі і марылі разваліць СССР? Яны ж усе былі, як кажуць, плоць ад плоці сістэмы?

— Гэтае акружэнне, безумоўна, сыграла сваю ролю. Але ўсё ж такі наўрад ці варта гаварыць пра нейкі яго лёсаносны ўплыў на тагачасныя падзеі. І тут я нісколькі не супярэчу сам сабе... Па вялікім рахунку, хто такія былі Бурбуліс, Шахрай, Козыраў?. Дзе яны сёння? А тады ў іх усіх была, відаць, нейкая герастратавая эйфарыя ад уседазволенасці — падумаеш, лёс краіны, лёс мільёнаў людзей?! На паперы ўсё павінна было выглядаць прыстойна і проста: "Быў СССР — няма СССР!". Гэтыя людзі не цягнуць на маштаб мефістофелеўскіх глабальных ліхадзеяў, усвядомлена прагнуўшых ліха дзесяткам мільёнаў людзей. Проста не той маштаб!.. Але ад гэтага наступствы ўчыненага не становяцца меншымі.

Захад нам дапамог?..

— Шмат пісалася і гаварылася пра ўдзел ў дэмантажы СССР Захаду...

— Мы з вамі ўжо закраналі гэтую тэму... Паўтараю, у Захада, адрозна ад СССР, былі простыя тактыка і стратэгія, заснаваныя на метадзе найменшых затрат. Зразумела, СССР быў геапалітычным канкурэнтам, і Захад быў наўпрост зацікаўлены ў яго аслабленні. У плане ўздзеяння на працэсы ў СССР галоўны прынцып у іх быў наступны: калі яны ідуць, як належыць — дапамагаем і спрыяем, калі не, то крытыкуем і імкнемся скіраваць іх у патрэбнае рэчышча... А радыкальна Захад ніколі не ўмешваўся, добра разумеючы, па-першае, што такое ўмяшальніцтва дорага яму абыдзецца, а па-другое, што з цягам часу "плод" паспее самастойна, бо ўсё цякло ў СССР так, як і патрэбна было Захаду. Але, думаю, што і Захад не чакаў такой хуткай развязкі.

— А як жа звышпраніклівыя імперыялістычныя спецслужбы, якія "расшатвалі"?..

— Усе гэтыя размовы пра вызначальную ролю ў распадзе СССР спецслужб, разведак і гэтак далей, як мне падаецца, беспадстаўныя. Я добра ведаў магчымасці і ўзровень савецкіх спецслужб і ўпэўнены, што яны сваім заходнім калегам вольна разгуляцца не давалі ніколі. Мала таго, у апошнія гады мы не раз былі сведкамі раскрыцця былых савецкіх агентаў на самых адчувальных "нервовых" кропках заходніх палітычных і эканамічных інфраструктур. А колькі яны яшчэ не раскрылі? Справа была ў стане здароўя самой краіны, сістэмы...

— Ці ў стане "здароўя" палітычнага істэблішменту?.. Зрэшты, слова "здароўе" тут мажліва і не браць у двукоссе...

— Здароўе сістэмы якраз у многім і залежыць ад здароўя (і духоўнага, і фізічнага) тых, хто наверсе. Але не толькі здароўя, але і іх узроўню, і адпаведнасці маштабам задач. Гарбачоў, Лук'янаў, Ельцын і іншыя — гэта відавочная прыкмета выраджэння тагачаснага савецкага істэблішменту, яго дэградацыі, якая, зрэшты, пачалася яшчэ на пачатку 70-х. У крытычных для лёсу той ці іншай дзяржавы сітуацыях, а асабліва для лёсу такой вялізнай краіны-імперыі, як СССР, вельмі важна было, хто ў гэты час знаходзіцца на капітанскім мастку, наколькі цвёрда ён трымае штурвал, наколькі здольны "бачыць" і "чуць" рэальны поступ падзей. Дык вось, палітычны "слых" і "зрок" савецкіх кіраўнікоў апошніх гадоў, якія і выбіралі курс, быў, мякка кажучы, неадэкватным...

«Аб'ектыўныя фактары»

— Мы ўсё ж такі занадта шмат сёння надаём увагі суб'ектыўнаму фактару. Але сцвярджаюць, што якраз да 1991 года для СССР, кажучы тэхнічным тэрмінам, склалася крайне неспрыяльнае налажэнне розных аб'ектыўных адмоўных фактараў, у тым ліку і прыродных. Аднак толькі Чарнобыль і землятрус у Арменіі каштавалі СССР дзесяткі, а магчыма, і сотні мільярдаў долараў. У краіны было ў апошнія гады надзвычай складанае фінансавае становішча, яна набрала даўгоў у багатых крэдытораў на суму да 100 мільярдаў долараў і па сутнасці стала банкротам... Было б дзіўным, каб вынік такога крызісу быў нейкі іншы.

— Усё гэта так, але большасць гэтых адмоўных фактараў былі ўсё ж такі, як сёння кажуць, сістэмнымі. Адзін Чарнобыль не мог бы зваліць такую краіну... Чаго толькі каштавала звышцэнтралізацыя ў палітыцы і эканоміцы, якая каменем вісела на шыі дзяржавы і ўсяляк тармазіла яе развіццё. Калі кожны "чых" у якіх-небудзь Мцэнску, Глухаве ці Слуцку мусіў быць узгоднены ў Маскве. І якраз гэты момант улада заўсёды была ў стане падкарэкціраваць, прычым яшчэ задоўга да Гарбачова. Але не хацела... У СССР была надзіва дагматычная ідэалагічная сістэма, стрыжнем якой быў так званы прынцып дэмакратычнага цэнтралізму. Гэтая сістэма пільна сачыла за тым, каб ніхто ні на ёту не "адступаў ад норм"...

Дзіравы «каўпак»

— Няўжо ж у вялікай краіне, якая ўплывала на лёс амаль паловы свету, не існавала якога-небудзь сур'ёзнага абагульняючага аналітычнага цэнтра, дзе б усе гэтыя магчымыя наступствы можна было цвяроза і грунтоўна пралічыць і даць неабходныя парады кіраўніцтву краіны? Бо многія разбуральныя для краіны рэчы, як тая ж эканамічная і палітычная звышцэнтралізацыя, пра якую вы гаворыце, былі відавочныя для ўсіх. Наколькі вядома, у СССР не бракавала устаноў, што займаліся аналізам стану рэчаў у іншых краінах, а як наконт сваёй?..

— Вы ведаеце, хоць гэта і падасца сёння дзіўным, такой установы ў СССР не было. Іншых вывучалі і аналізавалі, а сябе — як след не атрымлівалася...

— А ў рамках усемагутнага КДБ, які быў па сутнасці дзяржавай у дзяржаве, пад "каўпаком якога", як казалі, былі мы ўсе?

— І ў іх такіх структур не было. Ну каму тады, напрыклад, магло прыйсці ў галаву ствараць установу для вывучэння, напрыклад, адмоўных наступстваў таго ж звышцэнтралізму? Не варта перабольшваць ролю КДБ. Ён быў заўсёды ў рамках сістэмы.

«Свяшчэнная карова» дэмакратычнага цэнтралізму

— Перабольшваць не варта, згодзен, але ж гэтая сістэма, валодаючы інфармацыяй, проста абавязана была дзейнічаць...

— Яна і дзейнічала, можаце мне паверыць... Але справа ўрэшце не ў КДБ і нейкіх канкрэтных структурах, а ў самой гэтай сістэме, заснаванай, паўтараю, на Яго Вялікасці прынцыпе дэмакратычнага цэнтралізму. Ён быў ключавым у структуры дзейнасці і КПСС усіх галін грамадскага жыцця, быў тым своеасаблівым фецішам, "свяшчэннай каровай", які нельга было чапаць. Ён жа быў і галоўным тормазам... Мне згадваецца адзін момант яшчэ з сярэдзіны 80-х. Ідзе пасяджэнне Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, старшынёй якога тады быў Андрэй Грамыка. На пасяджэнне запрасілі тагачаснага старшыню Дзяржплана СССР Юрыя Маслюкова. Я накіроўваю яму запіску з прапановай, каб тую прадукцыю, што рэспублікі вырабілі, яны маглі пакінуць у сябе і размяркоўваць на свой погляд. Тым самым можна было б пазбегнуць велізарных выдаткаў, калі, напрыклад, лес з Уладзівастока везлі ў Барысаў, а з Барысава ва Уладзівасток... У перапынку Маслюкоў падышоў да мяне і кажа: " Гэтак мы ўсё раздамо, а дзе ж тады цэнтралізм, чым тады займацца Дзяржплану?" Такое пытанне магло вырашыць у той час толькі Палітбюро ЦК, але старшыня Дзяржплана і не думаў яго туды выносіць. Ён жа не мог секчы сук, на якім сядзеў? Яму было зручна жыць, як раней — усё дзяліць і размяркоўваць. Я глыбока ўпэўнены, што калі б яшчэ падчас прыходу да ўлады таго ж Брэжнева пачалося рэфармаванне сістэмы, лёс СССР мог бы быць радыкальна іншым...

— Але ж тады ў сярэдзіне 60-х быццам бы па ініцыятыве Аляксея Касыгіна пачыналіся нейкія структурныя рэформы?

— Так, Касыгін — талковы і разумны чыноўнік — нешта спрабаваў змяніць, але гэта была кропля ў моры ў рамках такой жорсткай сістэмы. Я хачу сказаць, што патэнцыял кіруючай гвардыі тады, у сярэдзіне 60-х, быў яшчэ вельмі высокі. А асабліва ў самога апарата КПСС. Гэта быў яшчэ дастаткова магутны апарат, у якім працавала шмат разумных і талковых людзей. Кожны паасобку, яны цудоўна разумелі сітуацыю. Але вось, калі збіраліся разам, гэтае разуменне некуды раптам знікала. Над усім навісаў той самы злавесны дамоклаў меч дэмакратычнага цэнтралізму. Ну і, зразумела, нядрэмнае вока такіх ідэалагічных сталпоў сістэмы, як Суслаў, Кірыленка і іншых рытуальных жрацоў-захавальнікаў камуністычнага "агменю". Якраз яны былі вышэйшымі "суддзямі".

«А суддзі хто?»

— Ну і як, судзілі па праўдзе?

— Усяляк бывала... Была і "Праўда"... Але, разумееце, для таго, каб пра нешта судзіць, патрэбен пэўны ўзровень асобы. Але які быў узровень гэтых "суддзяў"?.. На 26 з'ездзе КПСС Кірыленку было даручылі прачытаць спіс новаабраных членаў ЦК. Дык вось, гэты "стоўп" не мог як след той тэкст прачытаць. Звычайна, калі чалавек чытае, то схоплівае слова цалкам. А Кірыленка мог схапіць толькі пару першых літар, а далей дадумваў. У выніку атрымлівалася несусветная тарабаршчына. Трэба было бачыць, з якой цяжкасцю нават такім прававерным камуністам, як дэлегаты з'езда, было цяжка стрымліваць смех. А гэта быў на той час трэці чалавек у дзяржаве!..

Так што перадумовы Віскулёў ствараліся доўга, не адно дзесяцігоддзе. Праблемы назапашваліся як у снежным камяку і ўрэшце абрынулі лавіну пад назваю Віскулі. У Белавежскай пушчы быў толькі канстатаваны факт...

Наступствы...

— Падводзячы вынік нашай размове, хацелася б пачуць Вашу ацэнку наступстваў віскулёўскіх пагадненняў.

— Калі гаварыць увогуле, то тое, што было зроблена, усё ж такі ў гістарычным плане было неміннучым, а значыць, патрэбным. Іншая справа, як гэта трэба было рабіць. Дык вось, многае зроблена было тады проста неразумна. Былі непадрыхтаваныя і непрадуманыя многія рэчы. Чаму перад тым, як сесці падпісваць такія дакументы, не вырашылі хаця б папярэдне, пытанне са зброяй, прычым не толькі ядзернай, а злачынна легкадумна пусцілі яго на самацёк? І гэта адно з самых галоўных адмоўных наступстваў Віскулёў. Чаму не абгаварылі пытанне аб энерганосьбітах? Напрыклад, наша рэспубліка брала актыўнейшы ўдзел у будаўніцтве газанафтаздабываючых комплексаў у Сібіры. І мы нічога з гэтага не атрымалі.

— Відаць, у гэтым не вельмі была зацікаўлена Расія? Але куды глядзелі нашыя "правадыры"? Няўжо не разумелі, што пры ўсялякіх разводах абавязкова трэба дэталёва абгаворваць матэрыяльны бок?

— Нашы ўдзельнікі Віскулёў і Шушкевіч, і Кебіч, на мой погляд, тады проста не бачылі ў перспектыве, чым гэта ўсё абернецца. Я думаю, што ім здавалася ў тыя дні, што гэта нейкая гульня. Маўляў, сёння пагуляем, папалохаем Гарбачова, а назаўтра прачнемся — і ўсё будзе па-ранейшаму. Але тая гульня аказалася незваротнай.

— Вы забыліся пра разарваныя па-жывому сувязі...

— Гэта ўсё я лічу прапагандай...

— А станоўчыя наступствы?

— У выніку гэтых пагадненняў на карце свету з'явілася *незалежная Рэспубліка Беларусь — векапомная мара многіх пакаленняў беларусаў.*

... і перспектывы

— Давайце крыху закранем перспектывы. Сёння на гэты конт крайне дыяметральныя погляды. Адны сцвярджаюць, што пасля прэзідэнцкіх выбараў "(2001 года. — Аўт.), што прайшлі не так ,як хацелася Захаду, мы патрапім у глухую эканамічную і палітычную ізаляцыю. Другія, што толькі цяпер мы і атрымалі магчымасць для нармальнага паўнакроўнага развіцця, пазбавіўшыся розных "тармазоў".

— Я ўжо казаў, што я не прарок. Але, мне здаецца, галоўнае пытанне нашых перспектыў — ці захаваем мы незалежнасць сваёй краіны. На сённяшні дзень яна ўсё ж такі знаходзіцца ў падвешаным стане. Бо ў сённяшніх інтэграцыйных працэсах з Расіяй незалежнасць пэўным чынам ёсць сродак палітычнага гандлю. Людзі нашы не разумеюць сёння гэтых працэсаў, не бачаць пакуль з іх рэальных вынікаў. А той жа наш палітычны істэблішмент, я думаю, таксама не да канца ўсведамляе магчымыя наступствы такой палітыкі. І гэтым сённяшняя сітуацыя нечым нагадвае віскулёўскія часы. У першую чаргу наступстваў для саміх сябе. Няўжо ж яны не ўсведамляюць, што ні на якія палавінчатыя саюзы Расія ніколі не пойдзе, бо тым самым дасць небяспечны прыклад сваім вялікім аўтаномізм? І якую ролю будуць выконваць нашы палітычныя эліты пасля страты суверэнітэту Беларусі на расійскай палітычнай сцэне? Я разумею займаючых у нас высокія пасады расейцаў, яны і ехалі да нас з пэўнымі мэтамі... Але вось свае?.. Я добра ведаю іх псіхалогію, бо шмат гадоў з многімі працаваў поруч. У іх заўсёды быў моцным інстынкт самазахавання. Упэўнены, што ён не загінуў, гэты інстынкт... Але, нягледзячы ні на што, я лічу, што гісторыя развіваецца сёння такім чынам, тэндэнцыі яе такія, што незалежнасць мы захаваем.

Што да нашых эканамічных перспектыў, то гэтае пытанне вельмі складанае. На сённяшні дзень палітыка заблакіравала эканоміку. Але праз нейкі час яна, як усё жывое, праб'е сабе дарогу. Не магу сказаць нешта пэўнае пра бліжэйшы год-два, але калі браць крыху больш аддаленыя перспектывы, то я ўпэўнены, што эканоміка, як і жыццё, возьме сваё...

Алесь ГІБОК-ГІБКОЎСКІ.

ЗВЕЗДЫ В ГОСТЯХ У “НАРОДНОЙ ВОЛИ”

Сергей АЛЕЙНИКОВ:

«Нельзя быть хорошим для всех»

Прославленный белорусский футболист, лучший футболист прошлого столетия Сергей АЛЕЙНИКОВ, проживающий последние пятнадцать лет в Италии, улетел на этой неделе из Минска в “страну-сапог”, так и не найдя взаимопонимания с белорусскими футбольными функционерами.

Накануне отлета **Сергей АЛЕЙНИКОВ** пообщался с корреспондентом “Народной воли”.

— Сергей, сколько на этот раз Вы пробыли в Минске?

— Одиннадцать дней. Меня сюда пригласили организаторы турнира, посвященного 80-летию “Динамо”. Попросили помочь в организации приезда какой-нибудь итальянской юношеской команды. Я и привез команду, за которую играет мой младший сын, а заодно воспользовался моментом, чтобы побыть дома.

— Ранее Вы тоже приезжали и готовы были возглавить белорусский клуб “Витебск”. Но не получилось. Остался неприятный осадок?

— Конечно, остался, но нет смысла зацикливаться на пройденном этапе. Назовем это издержками производства.

— Не от таких ли “издержек” и все беды белорусского футбола?

— Честно говоря, мне уже немножко надоело говорить на эту тему по той простой причине, что как только я начинаю высказывать свое мнение, все начинают думать, что меня очень сильно обидели, что во мне говорит в первую очередь обида и у меня есть какие-то претензии к нашим футбольным функционерам. Нет у меня к ним претензий. Да, меня действительно пригласили возглавить витебский клуб и поставили задачу попасть в тройку призеров. Но после того, как я посмотрел команду, сказал, что это нереально. В итоге мэр Витебска на встречу так и не пришел, а по телевидению сообщили, что со мной не хотят иметь никаких дел. После этого я высказался о том, что думаю о белорусском футболе. Сейчас функционеры от футбола не могут или не хотят понять, что я просто высказываю свою точку зрения. Назовем это — свежим взглядом на то, что происходит. Я же ни на что не претендую, хотя уже говорил, что воз и ныне там. Посмотрите — детский футбол в Беларуси, по-моему, даже в худшем состоянии, чем взрослый.

— Но Вы видите перспективы у белорусского футбола?

— На данный момент и на ближайшее время — не вижу. Чтобы была перспектива, здесь надо работать. А я этого не вижу. Пускай на меня обижаются или не обижаются. Как мне кажется, работа с детьми ведется очень слабо.

— Как это слабо, если в райцентрах строятся ледовые дворцы, возводятся футбольные поля?

— Я и говорю, что внешне вроде все хорошо. Но, понимаете, нельзя построить какой-то один отдельно взятый дворец и сказать, что у нас идет развитие вида спорта. К дворцу, чтобы знали, нужны еще дети, нужны специалисты с хорошей зарплатой. Все должно быть в комплексе. Если не начать движение сейчас, то догнать передовые футбольные страны Европы будет практически невозможно. Это как в автомобилестроении. Я не знаю, на бумаге программа развития белорусского футбола, может, и есть, но на практике ее не видно.

— Сергей, и все же... Почему сегодня такой известный футбольный специалист, как Алейников, оказался не нужен Беларуси?

— Это вопрос не ко мне. Задайте его тому, кто руководит белорусским футболом.

— Но сами, насколько я понял, Вы хотели бы работать здесь?

— Если меня пригласили и я приехал сюда на переговоры, то наверняка же обдумал все. Но затем все перевернулось, поменялось, и я понял, что на ближайшие годы перспективы здесь никакой. С такими подходами “каши не сваришь”.

— Беды сборной отсюда же?

— На мой взгляд, сборная — это финальная картина развития всего белорусского футбола. Даже ко многим игрокам сборной слово “профессионализм” сегодня будет не к месту.

— А к месту ли будет в сборной иностранный тренер?

— Я думаю, что у нас неправильно ищут проблему. Дело-то ведь не в том, кто будет тренер — белорус или иностранец. Дело во всей системе развития белорусского футбола. Пригласите вы любого тренера, он побудет пару лет, если выдержит этот срок, и уйдет. А белорусский футбол ведь должен развиваться. Единственный положительный момент в приглашении иностранного специалиста может быть только один: этот тренер может дать толчок в направлении профессионального развития футбола. Я, кстати, один из первых высказался за то, чтобы сборную тренировал иностранный специалист, рядом с которым работал бы и белорусский. Последний, во всяком случае, сможет почерпнуть для себя что-то полезное.

— А Ваша кандидатура на пост главного тренера не рассматривалась?

— Со мной на эту тему никто никогда не говорил.

— Сергей, сейчас многие игроки сборной отказываются от выступления за команду, обижаются на тренеров... А Вам тяжело было попасть в сборную Союза?

— Очень тяжело. Если игрок не соответствовал какому-то уровню, то практически невозможно. Потому что раньше сборная составлялась блочно. Был блок киевского “Динамо”, был блок московского “Спартака” и был блок тбилисского “Динамо”. Скажем так, “иногородним” попасть туда было очень непросто.

— Встречаетесь с друзьями по сборной?

— Специально таких встреч не организовываем, но случается, что видимся на каких-то юбилейных мероприятиях. Сейчас вот был на матче 50-летия Рината Дасаева, встретил многих старых друзей.

— А в сборной Вы с кем дружили?

— Отношения со всеми были хорошие, но, может быть, чуть больше была дружба с киевлянином Рацем.

— Сергей, чем сейчас Вы будете заниматься в Италии?

— Я получил лицензию “Pro” и возглавил команду шестого дивизиона “Крас”. Городок недалеко от Фиесты. Это за тысячу километров от Лечче, где мы живем с семьей, но, думаю, что расстояние не проблема.

— Сколько лет Сергей Алейников уже в Италии?

— Более пятнадцати лет.

— Для Италии Вы, наверное, уже свой?

— Я бы не сказал. Я — космополит, мне хорошо в любой точке планеты. Лишь бы были рядом любимые семья и работа. Просто так сложилось, что в Италии мне пришлось прожить дольше.

— Первое время там тяжело было?

— Особых проблем не ощущал. Единственные неудобства — это незнание языка и каких-то местных обычаев. Но это дело поправимое. Я же уезжал туда одним из первых. “Ювентус” тогда сразу же снял мне виллу, условия по сравнению с нашими были шикарные. В бытовом плане там вообще никаких проблем не было — только играй. Сейчас в Лечче у меня тоже свой домик, скоро станет моим. Не очень большой, так что никакой прислуги нет. Да и лучше себя никто не уберет, тем более что жена у меня домохозяйка.

— Сергей, Ваш младший сын пошел по стопам отца, играет в футбол. А старший?

— Старшему уже 20 лет, он футболом не интересуется. Учится в Италии в университете на инженера-программиста.

Не знаю даже — останется после окончания университета там или сюда приедет. Сейчас такой мир, что все меняется быстро, что-то планировать очень тяжело.

— Женится на итальянке да останется...

— В Италии очень поздно женятся и выходят замуж. Не раньше тридцати лет. Когда люди уже становятся на ноги, когда у них есть где жить, на что содержать семью и детей. Так что я для итальянцев, который женился в 24 года, очень даже ранний. Но для нас это по-моему, самый оптимальный возраст.

— Когда сейчас обратно в Минск?

— Не знаю, планов пока никаких. Может быть, будет организован матч в честь 25-летия победы минского “Динамо” и меня позовут. А может быть, и нет. На 20-летие меня, например, не приглашали.

— Часто вспоминаете те времена, когда в 82-м минское “Динамо” стало чемпионом Союза? Или для Вас это уже история?

— Я-то вспоминаю, но, мне кажется, с развалом Союза наш период люди как-то неосознанно отодвинули на второй план. И только сейчас потихоньку начинают вспоминать — да, мол, было у нас такое минское “Динамо”, был другой футбол... Нельзя забывать историю. Не только в спорте.

— Уезжаете без обиды?

— Нет смысла обижаться. Они идут своей дорогой, я — своей. Идем параллельно друг другу, причем в разных направлениях. Хотя, может быть, когда-нибудь и пересечемся. Я понял, что нельзя быть хорошим для всех. Нормальные люди меня поймут...

Алесь СИВЫЙ.
Фото автора.

ДАРОГА

Пакаранне будзе жорсткім

Сталічная Дзяржаўтаінспекцыя будзе прымяняць максімальныя санкцыі да вадзіцеляў, якія не прышпільваюцца рамянямі бяспекі. Цяпер за такое правапарушэнне іх чакае штраф у памеры 31.000 рублёў. Такое рашэнне прынята кіраўніцтвам ГУУС Мінгарвыканкама, паведамілі ва ўпраўленні ДАІ.

Новаўвядзенне ў Дзяржаўтаінспекцыі тлумачаць наступным чынам: *“Узнікла неабходнасць прымаць самыя жорсткія меры. Паколькі людзі самі не хочуць клапаціцца пра сваю бяспеку, гэта мусяць зрабіць супрацоўнікам ДАІ”.*

Да ведама, у пункце 4 артыкула 18.12. Кодэксу Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях “Парушэнне правілаў эксплуатацыі транспартнага сродку” гаворыцца: *“Кіраванне транспартным сродкам вадзіцеля, які не прышпілены рамянём бяспекі, перавозка пасажыраў, не прышпіленых рамянямі бяспекі, калі канструкцыяй транспартнага сродку прадугледжаны рамяні бяспекі, а таксама кіраванне матацыклам або перавозка на ім пасажыраў без моташлемаў або з незашпіленымі моташлемамі — караюцца папярэджаннем або накладаннем штрафу ў памеры да адной базавай велічыні”.*

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

ХОЧАЦЕ — ВЕРЦЕ, ХОЧАЦЕ — НЕ

БРСМ будзе будаваць новую «Лінію Сталіна»

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі збіраецца будаваць новую “Лінію Сталіна”.

У Петрыкаўскім раёне Гомельскай вобласці да сённяшняга часу ў паўразбураным стане захаваліся бункеры і доты. Адзін з іх, напрыклад, быў вялікі, у некалькі накатаў- "паверхаў", і меў ажно чатыры выхады. У гэтым агнявым пункце можна было пражыць цэлыя тры месяцы, не выходзячы на паверхню.

Уражваюць і іншыя абарончыя збудаванні ваеннага характару “Лініі Сталіна”. Вось іх і задумалі аднавіць у абласной арганізацыі БРСМ...

НУ І НУ!

Скралі... дах і сцяну

Органы дазнання Веткаўскага РАУС распачалі крымінальную справу па факце крадзяжу ў вёсцы Фёдараўка часткі драўлянага дома, які належыць жыхару Гомеля.

Як паведамілі ў Веткаўскім РАУС, у родную вёску гамяльчанін прыязджаў нячаста. Ён лічыць, што дах і сцяна дома зніклі ў перыяд з красавіка па ліпень. Паводле інфармацыі РАУС, вёска Фёдараўка — паўадселеная, там жывуць усяго некалькі сем’яў. Хутчэй за ўсё нехта разабраў дом на асабістыя патрэбы.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

ВЫШУК

Расія вялікая, але не схаваўся

У Падмаскоўі затрыманы беларускі грамадзянін, які знаходзіўся ў міжнародным вышуку за бандытызм.

53-гадовы Мікалай Салдаценка падазраецца ў дачыненні да стварэння “марозаўскай” злачыннай групоўкі, што дзейнічала на тэрыторыі Гомельскай вобласці ў 1990—2004 гадах.

М.Салдаценка быў затрыманы ў Дзмітраўскім раёне Маскоўскай вобласці, дзе арандаваў загарадны дом.

Вырашаецца пытанне аб экстрадыцыі М.Салдаценкі ў Беларусь.

Нагадаем, што 29 мая Вярхоўны суд Беларусі пачаў разгляд другой крымінальнай справы ў дачыненні да членаў злачыннай арганізацыі Сяргея Марозава. Першы прыгавор па справе “марозаўскай” групоўкі Вярхоўны суд вынес 1 снежня 2006 года. За шэраг цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў тры найбольш актыўныя члены банды — Сяргей Марозаў, Валерый Гарбаты і Ігар Данчанка — былі прыгавораны да вышэйшай меры пакарання (расстрэлу). Астатнія ўдзельнікі злачыннай арганізацыі асуджаны да розных тэрмінаў зняволення — ад 20 гадоў пазбаўлення да двух гадоў абмежавання волі. У складзе банды было прыкладна 50 чалавек.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

СТРАТЫ

Памёр вядомы фалькларыст Васіль Ліцвінка

Яму было 65 гадоў... Ён найбольш вядомы тым, што ад 1987-га да 2003 года вёў на Беларускім тэлебачанні аўтарскую праграму “Запрашаем на вячоркі”.

Таксама здзейсніў шмат навуковых экспедыцый па Палессі. Фалькларыста ведалі аматары народнай песні ва ўсіх рэгіёнах краіны.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

...А дома Вас чакае «Народная воля»

Жнівень — месяц, калі вяртаюцца з адпачынку ўсе, каго ў верасні чакае работа, вучоба, служба...

Вы пераступаеце парог роднага дома, кватэры, а Вас чакае “Народная воля”. Таму не забудзьце зрабіць **перадаплату** за нумары будучых месяцаў.

Паўтараем: не маеце магчымасці заплаціць за нумары ўсіх месяцаў да канца года — зрабіце **перадаплату** за любы тэрмін: за месяц, два, тры...

Агітуйце за “Народную волю” блізкіх, суседзяў, сяброў па працы, вучобе.

А чаму б не аформіць **перадаплату** за будучыя нумары для таго, каго Вы збіраецеся віншаваць з днём народзінаў ці з нейкай іншай нагоды?

Ведаеце людзей, якія з задавальненнем чыталі б “Народную волю”, але, на жаль, у іх цяжкае фінансавае становішча? Калі ласка, дапамажыце ім аформіць **перадаплату**, ваша дабрачыннасць адгукнецца шчырай удзячнасцю ў сэрцах тых, каму Вы зрабілі дабро.

Каб аблегчыць вашы клопаты, і сёння друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом “Народнай волі”, паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары бягучага і наступных месяцаў (можна да канца года), **тэрмінова** наведайце любы філіял “Беларусбанка”, а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць апературыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Банкаўскія рэквізіты “Народнай волі” такія:

УП “Народная воля”: р/р 3012006535014, ААТ “Пріорбанк”, ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом *д.,в.,к.* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ТРАГЕДЫЯ

Не выратавалі

У Ельскім раёне памерла састарэлая жанчына, якая заблудзілася і правяла ў лесе прыблізна трое сутак.

Як паведамілі БелаПАН у аддзеле ўнутраных спраў Ельскага райвыканкама, 86-гадовая жыхарка вёскі Санькі пайшла ў лес па грыбы і не вярнулася. Яе пошукамі займаліся падраздзяленні РАУС, МНС, лясніцтвы і мясцовыя жыхары. Праз трое сутак яе знайшлі ў лесе каля вёскі Бабруйкі, што размяшчаецца на адлегласці пяці кіламетраў ад яе роднай вёскі. Жанчыну адправілі ў бальніцу, дзе праз нейкі час яна памерла. Паводле інфармацыі праваахоўных органаў — ад абязводжвання арганізма.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

Паслугі

Прыём шклатары і інш.
Тэл. 261-11-87.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 24.07.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №